# СЁННЯ АДКРЫВАЕЦЦА XVIII З'ЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ СССР

**У яго рабоце прымае ўдзел дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі ГДУ В. П. Горленка**

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

№ 6 (643) | Аўторак, 24 лютага 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## СХОД ПРАЦОЎНАГА КАЛЕКТЫВУ

19-га лютага ў актавай зале адбыўся сход працоўнага калектыву універсітэта.

Заслухана паведамленне прарэктара па АГР У. А. Шаўчэнкі аб выніках выканання плана капітальнага будаўніцтва і задачах на 1987 год.

Прарэктар па завочнаму навучанню Л. Н. Сечка праінфармаваў калектыў ГДУ аб выніках праверкі універсітэта Рэспубліканскім камітэтам народнага кантролю.

На сходзе заслухана справаздача старшыні універсітэцкай арганізацыі таварыства барацьбы за цвярозасць В. П. Дзядзічкіна аб яе рабоце за мінулы год.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1986 год сярод факультэтаў і кафедр яго пераможцам уручаны ўзнагароды.

## АВЕЯНАЯ СЛАВАЙ

Учора савецкі народ адзначыў 69-ю гадавіну Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Слаўны шлях прайшлі нашы Узброеныя Сілы за гэты адрэзак часу — ад абароны заваёў Вялікага Кастрычніка ад белагвардзейцаў і замежных інтэрвентаў да сённяшніх дзён, калі яны надзейна стаяць на варце свяшчэнных граніц нашай краіны.

Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту ўрачыста адзначаны ва універсітэце. У госці да студэнтаў прыйшлі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, якія падзяліліся з моладдзю сваімі ўспамінамі аб грозных і цяжкіх гадах, калі байцы Савецкай Арміі вялі жорсткую барацьбу з фашызмам, заклікалі юнакоў і дзяўчат берагчы мір на Зямлі.

Ва універсітэцкім парку да помніка загінуўшых воінаў, партызан і падпольшчыкаў студэнты ГДУ ўсклалі вянок, аддалі даніну павагі змагарам за свабоду Радзімы.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, НДС горача віншуюць старшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі СЫЦЬКО Уладзіміра Уладзіміравіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**Паважаныя бацькі! Для вашых дзяцей-школьнікаў ва універсітэце праводзяцца кансультацыі выкладчыкаў ГДУ па матэматыцы, фізіцы, мовах. За даведкамі звяртайцеся ў жансавет універсітэта (галоўны корпус, ауд. 1-18, у першы і трэці аўторак месяца — з 14 да 16 гадзін, другі і чацвёрты — з 12 да 14 гадзін).**

**ЖАНСАВЕТ ГДУ.**

## НАШ ДЭЛЕГАТ

**У жыцці кожнага чалавека ёсць падзеі, якія становяцца самай прыкметнай вяхой. Для дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі Валянціны Парфёнаўны Горленка незабыўным стане XVIII з'езд прафсаюзаў СССР, у рабоце якога ёй пашчасціла ўдзельнічаць.**



НА ПЕРШЫ погляд гэта — звычайная жанчына. Сярод іншых, здаецца, нічым асаблівым не вызначаецца. Сціплая, малапрыкметная і разам з тым па-сапраўднаму захопленая сваёй справай, мэтанакіраваная.

Звязаць свой лёс з адной з самых пачэсных і ўдзячных прафесій педагога В. П. Горленка марыла яшчэ за школьнай партай. Па заканчэнні Шарпілаўскай дзесяцігодскі яна пачынае працаваць старшай піянерважатай. Адначасова набывае вышэйшую адукацыю на завочным факультэце нашага універсітэта, які паспяхова закончыла ў 1975 годзе. Да таго часу яна набыла ўжо некаторы педагагічны вопыт выкладчыцы рускай мовы і літаратуры.

Далейшы працоўны шлях Валянціны Парфёнаўны звязаны з кафедрай педагогікі і псіхалогіі ГДУ. Пачынала тут лабаранткай. І адразу ж актыўна ўключылася ў навукова-даследчую работу. Рыхтавала метадычны матэрыял для настаўнікаў, выступала з навуковымі публікацыямі ў часопісе «Народная асвета», «Настаўніцкай газеце». Усё гэта стала асновай для паступлення ў аспірантуру і канчатковага вызначэння напрамку далейшых навуковых даследаванняў. Ва ўстаноўлены тэрмін пад навуковым кіраўніцтвам прафесара І. Ф. Харламава яна падрыхтавала і паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю.

Ужо на працягу больш шасці гадоў В. П. Горленка — выкладчыца нашай кафедры. Акрамя асноўнага курса лекцый па педагогіцы яна вядзе спецсемінар «Выхаваўчая работа класнага кіраўніка з калектывам вучняў», спецкурсы «Прафесіянальная арыентацыя школьнікаў», «Тэарэтычныя і метадычныя асновы выхаваўчай работы ў піянерскім лагеры», паспяхова кіруе педагагічнай практыкай студэнтаў.

Нягледзячы на вялікі аб'ём вучэбнай нагрузкі, Валянціна Парфёнаўна плённа займаецца навукай. На яе рахунку ўжо 26 навуковых прац.

В. П. Горленка з'яўляецца прафгрупоргам нашай кафедры, прымала ўдзел у рабоце Усесаюзнага з'езда галіновага прафсаюза. Выбранне яе дэлегатам XVIII з'езда прафсаюзаў СССР — высокае давер'е не толькі для яе самой, але і прызнанне нашага універсітэта як вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся.

**Ф. КАДОЛ,**
**дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі.**

**НА ЗДЫМКУ: В. П. Горленка.**

Фота **А. Ульянкінай.**

## СТВОРАНА АРГАНІЗАЦЫЯ ВЕТЭРАНАЎ

У нашай краіне вялікая армія ветэранаў вайны і працы. Многія з іх знаходзяцца на заслужаным адпачынку, некаторыя — працягваюць працаваць. Усе яны акружаны пастаяннымі клопатамі і ўвагай. Разам з тым Камуністычная партыя і Савецкі ўрад зацікаўлены ў актывізацыі працоўнай і грамадскай дзейнасці ветэранаў на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва, павышэнні іх ролі ў выхаванні падрастаючага пакалення, у вырашэнні ўсіх сацыяльна-эканамічных задач.

Каля 70 ветэранаў вайны і працы ў калектыве нашага універсітэта. На мінулым тыдні ў сераду яны сабраліся на ўстаноўчы сход універсітэцкай арганізацыі ветэранаў вайны і працы. Уступным словам яго адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

На сходзе выступілі памочнік прарэктара па АГР, палкоўнік у адстаўцы М. П. Шкарбун. Ён расказаў аб мэтах стварэння ў працоўных калектывах арганізацый ветэранаў вайны і працы, асноўных задачах і змесце іх работы.

Выбраны савет ветэранаў вайны і працы. У яго ўвайшлі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны дацэнт кафедры гісторыі СССР і БССР Г. С. Еўдакіменка, палкоўнік у адстаўцы, начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі, палкоўнік у адстаўцы, супрацоўнік кафедры фізічнага выхавання А. А. Косцікаў, падпалкоўнік у адстаўцы, былы ваенны лётчык А. А. Баскакаў, удзельніца партызанскага руху на Гомельшчыне Т. С. Янкова, якая да ўходу на пенсію працавала дацэнтам кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, Н. В. Волкава, В. Р. Сіманаў, працаваўшыя да пенсіі адпаведна на кафедры галіновых эканомік і кафедры тэарэтычнай фізікі.

На арганізацыйным пасяджэнні савета яго старшынёй выбраны Г. С. Еўдакіменка, намеснікам старшыні — А. А. Баскакаў, сакратаром — Т. С. Янкова.

На ўстаноўчую канферэнцыю Цэнтральнага раёна г. Гомеля дэлегатамі выбраны Г. С. Еўдакіменка, Т. С. Янкова, Герой Сацыялістычнай Працы, дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі М. А. Дзмітрыеў, былы камандзір партызанскага палка, член КПСС з 1924 года, дацэнт І. А. Ільіных, дацэнты В. Р. Сіманаў, Л. А. Цацэрына.

Перад ветэранамі вайны і працы выступіў рэктар акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Б. В. Бокуць. Ён расказаў аб перспектывах развіцця універсітэта, яго будучых навабудоўлях.

*Дні памяці А. С. Пушкіна*

# НЕВЫЧАРПАЛЬНАЯ КРЫНІЦА

А. С. Пушкін... Ен для нас — цэлы свет, і колькі б ні мінала гадоў, яго імя застаецца неўміручым. Яно з намі заўсёды. А ў гэтыя дні мы з асабліва трапяткім адчуваннем, вялікай любоўю звяртаемся да выдатнай літаратурнай спадчыны вялікага паэта, яшчэ і яшчэ раз пераконваемся ў тым, як неабходна яна ўсім нам.

Дням памяці паэта прысвячалася ў лютаўскія дні шмат вечароў, канцэртаў, сустрэч, іншых разнастайных мерапрыемстваў ва ўсёй нашай краіне. У школьных класах і ў студэнцкіх аўдыторыях, у Дамах культуры гарадоў і вёсак, каля помнікаў паэту, памятных месц, звязаных з яго імем, пранікнёна гучалі паэтычныя радкі А. С. Пушкіна а таксама музыка, якая ўзнікла на аснове пушкінскіх сюжэтаў.

Не наталіць прагу душы савецкага чалавека да чыстай крыніцы рускага генія, які даў штуршок развіццю ўсёй нашай мастацкай культуры, у тым ліку і музычнай. Аб тым, якая невычарпальная спадчына пакінута нам А. С. Пушкіным, змаглі расказаць студэнтам ГДУ са сцэны актавай залы універсітэта выкладчыкі Гомельскага педвучылішча — удзельнікі літаратурна-музычнай кампазіцыі, прысвечанай памяці паэта.

Дзякуючы жаданым гасцям — выкладчыкам педагагічнага вучылішча — усе, хто прыйшоў у мінулы аўторак у актавую залу універсітэта, зноў далучыліся да мастацкага свету А. С. Пушкіна, поўнага святла, дабра і прыгажосці. На стварэнне шэдэўраў музычнага мастацтва паэзія Пушкіна натхняла яго сучаснікаў, працягвае натхняць і кампазітараў сённяшніх дзён. Са сцэны ў выкананні Л. Пранкевіч, Л. Сапацьковай, Л. Суравай, М. Янчанкі, Н. Сядовай, У. Махнача прагучалі творы Глінкі, Рубінштэйна, Рымскага-Корсакава, Вярстоўскага Чайкоўскага, Власава, Шарамецьева. Музычныя ілюстрацыі Г. Свірыдава да аповесці А. С. Пушкіна «Мяцеліца» выканаў ансамбль баяністаў вучылішча.

Гарачымі апладысментамі дзякавалі гледачы сваім гасцям за прыемныя мінуты, падараваныя ім, мінуты, азораныя іменем вялікага паэта.

З кожнай такой новай сустрэчай з цудоўнай спадчынай вялікага паэта мы становімся духоўна багацейшымі.

**Т. НІКАЛАЕВА.**



НА ЗДЫМКУ: на сцэне актавай залы універсітэта выступае ансамбль баяністаў педвучылішча.

# НАСТАЎНІЦАЙ ЖЫЦЦЯ

спрыяюць хуткаму росту маладых выкладчыкаў і вучоных. Не абышлося ў свой час і без памылак у падборы выкладчыкаў гістарычных дысцыплін. Але сёння можна з упэўненасцю сказаць, што «мукі нараджэння» гістарычным аддзяленнем у асноўным пераадолены. Склаўся калектыў з большасці дастаткова кваліфікаваных для выканання сваёй працы. Пэўныя якасныя зрухі прывялі да адкрыцця ў 1984 г. дзвюх гістарычных кафедр. Гэта наблізіла структуру гістарычнага аддзялення да тыповай для універсітэта сярэдняга ўзроўню.

Безумоўна, шмат якія цяжкасці яшчэ застаюцца, але ёсць упэўненасць у тым, што і яны паспяхова будуць пераадолены. Хвалюе, што нярэдка цяжкасці ствараюцца штучна, у выніку некваліфікаванага ўмяшання ў дзейнасць спецыялізаваных кафедр, іх падмены ў выкананні функцый, якія ім належаць. Узнікае пытанне аб павышэнні прафесійнага ўзроўню кіраўніцтва развіццём ва універсітэце гістарычнай адукацыі і даследаванняў. Яно, як мы лічым, павінна вырашацца ў адпаведнасці з курсам КПСС на дэмакратызацыю грамадскага жыцця ў краіне, неабходнасць якой яшчэ раз падкрэсліў студзеньскі (1987 г.) Пленум ЦК КПСС.

Са свайго боку гісторыкі ўжо зараз маглі б унесці больш значны ўклад у выкананне задач, якія стаяць перад ГДУ ў справе духоўнага развіцця маладых спецыялістаў. Безумоўна, павышэнне якасці падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі для сярэдніх школ застанецца важнейшай нашай задачай. Але разам з гэтым мы лічым магчымым расшырыць дыяпазон выхаваўчага ўздзеяння гістарычнай навукі. Было б мэтазгодным увесці ва універсітэце на шэрагу спецыяльнасцей факультатывы па гістарычнаму краязнаўству або з больш вузкай праграмай — аб вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі і культуры. Не разгортваючы тут аргументацыю гэтай прапановы, спашлемся толькі на тую высокую ацэнку, якую атрымаў вопыт гуманітарнай падрыхтоўкі спецыялістаў, накоплены ў Растоўскім універсітэце. Сваю аўтарытэтную думку аб неабходнасці яе паляпшэння ў век НТР выказаў нядаўна, маючы на ўвазе спецыялістаў прыродазнаўчых дысцыплін, акадэмік В. А. Лягасаў (гл. «Известия», 23 студзеня 1987 г.). Гэтыя ацэнкі пераклікаюцца з тым, што гаворыць вядомы спецыяліст у галіне гісторыі айчыннай навукі акадэмік Д. С. Ліхачоў: «Калі ў эканоміцы можна навярстаць упушчанае, то страты ў культуры часцей за ўсё незаменныя. Зрэшты, без перамены клімату ў нашай культуры і эканоміка не зрушыць ні на крок».

Улічваючы важнасць праблемы, рэалізацыя нашай прапановы магла б пачацца ўжо ў будучым годзе з увядзення названых вышэй факультатываў на дзвюх ці трох спецыяльнасцях. Потым яны б маглі быць пашыраны і на іншыя спецыяльнасці. Увядзенне такіх факультатываў дало б магчымасць універсітэту накіроўваць у школы, ва ўстановы, на прадпрыемствы народнай гаспадаркі спецыялістаў, аб якіх можна сказаць, што яны не толькі не нанясуць у сваёй дзейнасці непапраўных страт помнікам гісторыі і культуры, але і здолеюць выкарыстоўваць іх у патрыятычным выхаванні, у культурным жыцці свайго горада ці раёна, што яны больш якасна будуць разумець і асаблівасці, і перспектывы развіцця краіны. Такім чынам быў бы знойдзены яшчэ адзін шлях да павелічэння ўкладу універсітэта ў павышэнне гістарычнай свядомасці насельніцтва, якая, заканамерна, іграе актыўную ролю ў грамадскай практыцы. «Павярнуць грамадства да новых задач, накіраваць на іх вырашэнне творчы патэнцыял народа, кожнага працоўнага калектыву, — такая найпершая ўмова паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны», — адзначана ў Палітычным дакладзе ЦК КПСС XXVII з'езду партыі. Увага да развіцця гістарычнай адукацыі з улікам яе сацыяльных функцый — адна з умоў вырашэння пастаўленай партыяй задачы.

**Р. ЛАЗЬКО,**
**загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, дацэнт.**

# ЗАПРАШАЕМ
## НА СУСТРЭЧУ З ПІСЬМЕННІКАМІ

**Беларускія пісьменнікі сталі частымі і жаданымі гасцямі нашага універсітэта. Чарговая сустрэча з імі адбудзецца на гэтым тыдні ў пятніцу. Наш універсітэт наведаюць першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Ніл Гілевіч, шырока вядомыя паэты зямляк Анатоль Грачанікаў, Анатоль Вярцінскі, Яўгенія Янішчыц.**

**У час сустрэчы будзе працаваць кнігарня, дзе кожны жадаючы зможа набыць кнігі твораў названых майстроў мастацкага слова, атрымаць іх аўтографы.**

**На сцэне з літаратурна-музычнай кампазіцыяй па творах беларускіх аўтараў выступіць калектыў мастацкай самадзейнасці Гомельскага педагагічнага вучылішча.**

**Пачатак сустрэчы — у 11 гадзін.**

# ЗА ЎДАРНУЮ ПРАЦУ

**Многія студэнты універсітэта, якія прымалі ўдзел у трэцім працоўным семестры-86, вызначыліся сваёй ударнай і самаадданай працай. На калгасных і саўгасных палетках, на будоўлях, у вагонах чыгуначных паяздоў і на борце самалёта можна было сустрэць юнакоў і дзяўчат, на атрадаўскай форме якіх была эмблема Гомельскага дзяржуніверсітэта. Байцамі СА ГДУ праведзена на месцах працы і вялікая грамадская, ваенна-патрыятычная работа.**

**За выдатную працу актывісты будатрадаўскага руху, лепшыя байцы мінулага лета ўзнагароджаны граматамі Гомельскага абкома камсамола. Яны ўручаны студэнтам на факультэцкіх камсамольскіх сходах.**

**(Наш кар.)**

*Слова — замежным студэнтам*

# ПОПЛЕЧ З НАДЗЕЙНЫМІ СЯБРАМІ

У гэтым месяцы народ маёй Радзімы — Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспублікі Шры-Ланка — адзначыў нацыянальнае свята — Дзень незалежнасці. 39 гадоў назад, 4 лютага 1948 года, у выніку гераічнай барацьбы з англійскімі каланізатарамі цэйлонскі народ набыў сваю доўгачаканую свабоду і незалежнасць.

Шры-Ланка перакладаецца з сінгальскай мовы як «цудоўная зямля». Сапраўды, гэта казачна прыгожая краіна — вастраўная дзяржава, якую па праву называюць жамчужынай Індыйскага акіяна. Тэрыторыя яе складае амаль 66 тысяч квадратных кіламетраў, насельніцтва — каля 16 млн. чалавек. Большасць яго (74%) — сінгальцы. Акрамя таго, у нас жывуць тамілы, маўры (нашчадкі арабаў), веды. Сталіца Шры-Ланкі — горад Каломба з насельніцтвам звыш 700 тысяч жыхароў.

Сучасная Шры-Ланка — аграрная дзяржава з развітай плантацыйнай гаспадаркай. Прырода Шры-Ланкі вельмі спрыяльная для вырошчвання розных трапічных культур: манга, какосавага арэха, каўчука, бананаў. Ва ўсім свеце вядомы высокаякасны цэйлонскі чай, вытворчасць якога мае вялікае значэнне для эканомікі краіны. Важнымі крыніцамі даходу з'яўляюцца таксама каштоўныя камені і замежны турызм. У шматлікіх гарадах краіны знаходзяцца буйныя музеі, якія маюць значную гістарычную каштоўнасць. Ланкійскія народныя ўмельцы славяцца сваім высокім майстэрствам і тонкім мастацкім густам.

Дыпламатычныя адносіны паміж Шры-Ланкой і СССР былі ўстаноўлены ў лютым 1957 года. Паміж дзвюма краінамі быў заключаны шэраг міжнародных пагадненняў аб гандлі, культурным і навуковым супрацоўніцтве. Пры садзейнічанні СССР у Шры-Ланка пабудаваны металургічны і шынны заводы, млынны камбінат. Акрамя таго, СССР аказвае дапамогу ў падрыхтоўцы ланкійскіх нацыянальных кадраў: штогод у Савецкі Саюз прыязджаюць для вучобы каля 150 юнакоў і дзяўчат з Шры-Ланкі.

У пачатку 30-х гадоў у Шры-Ланка з'явіліся першыя марксісцкія гурткі, а ў 1936 годзе была створана Сацыялістычная партыя Шры-Ланкі. Камуністычная партыя Шры-Ланкі, заснаваная ў 1943 годзе, актыўна змагаецца за жыццёвыя інтарэсы працоўных, выступае за тэрытарыяльную цэласнасць і адзінства краіны, змагаецца за мір і прадухіленне ядзернай вайны.

Зараз мая краіна перажывае цяжкія часы — у апошнія гады рэзка абвастрыліся адносіны паміж дзвюма буйнейшымі нацыянальнымі групамі — сінгальцамі і таміламі. Братазабойчыя сутычкі вядуць не толькі да людскіх ахвяр, але і наносяць значныя матэрыяльныя страты эканоміцы краіны. Гэтая нацыянальная праблема можа быць вырашана толькі мірным шляхам — у выніку перагавораў.

Я і мой сябар Сірысумана Валасмуле вывучаем рускую мову і літаратуру ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце. Пасля заканчэння вучобы мы вернемся на радзіму, якую вельмі любім, каб аддаць свае веды народу. Я, напрыклад, мару аб перакладчыцкай дзейнасці — мне вельмі хочацца пазнаёміць народ маёй краіны з творамі вялікіх рускіх і савецкіх пісьменнікаў: А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля, Л. М. Талстога, А. М. Горкага, М. А. Шолахава. Абмен дасягненнямі культуры заўсёды садзейнічае ўмацаванню дружбы паміж народамі.

**Дхамананда КАХАТАВІЛА,**
**студэнт 1 курса гісторыка-філалагічнага факультэта**
**(Дэмакратычная Сацыялістычная Рэспубліка Шры-Ланка).**

ТАБЕ, СТУДЭНТ

# ЯК ВЫВУЧАЦЬ ПРАГРАМНЫ МАТЭРЫЯЛ

Адна з задач перабудовы вышэйшай школы — павышэнне якасці падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. На жаль, многія студэнты не авалодалі навыкамі грунтоўнага вывучэння і засваення праграмнага матэрыялу. З гэтай нагоды хочацца даць для іх некалькі парад:

— Кожнаму студэнту неабходна ўважліва слухаць і абавязкова канспектаваць лекцыі з мэтай **першаснага ўспрыняцця і асэнсавання** вывучаемага матэрыялу, у выніку чаго дасягаецца яго **разуменне**, якое часта бывае павярхоўным, недакладным і няпоўным.

— Паколькі матэрыял, як правіла, не дастаткова асэнсоўваецца і хутка забываецца, трэба **ў той жа дзень,** калі была лекцыя, абавязкова перачытаць яе канспект і прымяніць прыём самакантролю **з мэтай больш глыбокага асэнсавання** вывучаемага матэрыялу і **засваення** фактаў і паняццяў.

— Неабходна абавязкова перачытаць канспект праслуханай лекцыі і папрацаваць над падручнікам перад чарговымі лекцыйнымі заняткамі па дысцыпліне і прымяніць прыём **самакантролю** з мэтай поўнага засваення вывучаемага матэрыялу, ажыццяўляючы такім чынам яго **расканцэнтраванае** запамінанне.

— Трэба акуратна выконваць заданні выкладчыка па вывучаемай тэме (рашэнне задач, выкананне практыкаванняў, вывучэнне першакрыніц і г. д.) для больш глыбокага асэнсавання і выпрацоўкі ўменняў і навыкаў па прымяненню засвоеных ведаў на практыцы.

— Вельмі важна грунтоўна рыхтавацца да практычных і семінарскіх заняткаў, трывала авалодаць вывучаемым матэрыялам з тым, каб актыўна ўдзельнічаць у дыскусіі, адказваць на пытанні выкладчыка, дапаўняць адказы аднакурснікаў і такім чынам пашыраць і паглыбляць свае веды.

— На працягу семестра трэба абавязкова 1—2 разы паўтарыць вывучаны матэрыял па канспектах лекцый, каб **не забыць яго, больш глыбока асэнсаваць і расканцэнтравана засвоіць.**

— Трэба грунтоўна перачытаць падручнік і канспекты лекцый па вывучаемай дысцыпліне перад экзаменам, прымяніўшы прыём самакантролю і давёўшы веданне матэрыялу да асэнсаванага, поўнага і свабоднага пераказу.

Выкананне гэтых метадычных патрабаванняў забяспечыць інтэнсіўнае інтэлектуальнае развіццё, высокую паспяховасць, перавод ведаў у доўгачасовую памяць.

Як сведчыць практыка, многія студэнты гэтых патрабаванняў не прытрымліваюцца, працуюць ад выпадку да выпадку, спадзяюцца на тое, што авалодаюць праграмным матэрыялам за 3—4 дні перад экзаменам. Але гэтыя спадзяванні, як правіла, не збываюцца. І вось чаму. Такая канцэнтраваная праца па авалоданню вывучаемым матэрыялам не дазваляе асэнсаваць яго грунтоўна, а значыць, і засвоіць. У выніку некаторыя звесткі, якія спрабуе ўтрымаць у памяці студэнт, носяць сумбурны характар, захоўваюцца толькі ў аператыўнай памяці і хутка забываюцца.

Такі «стыль» вучэбнай работы некаторых студэнтаў стварае толькі бачнасць вучэння, вядзе да самападману і нічога не дае ні для інтэлектуальнага развіцця, ні для прафесіянальнай падрыхтоўкі.

**І. ХАРЛАМАЎ,**
**прафесар, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі.**



Прырода і мы

# У АДКАЗЕ ЎСЕ

Праблема навакольнага асяроддзя з кожным годам становіцца ўсё больш актуальнай. Пытанні яе аховы — самыя злабадзённыя ў нашыя дні, бо, кажучы словамі Ф. Энгельса, «чалавек ёсць частка прыроды».

А што робім мы для аховы і захавання нашай выдатнай прыроды, яе багаццяў?

Хутка ў свае правы ўступіць вясна. Гэта — чароўная пара года. Пара, калі абуджаецца і абнаўляецца прырода, пара звонкай песні шпака, маладой зеляніны і кветак. Яна асабліва радуе нас таму, што прыходзіць на змену доўгай, суровай зіме з яе моцнымі маразамі, частымі завірухамі і вялікімі снегападамі. Вясна заўсёды прыносіць з сабой цяпло, жыццё.

Вясну мы сустракаем ва ўмоўных межах часу — ад з'яўлення лядовых карункаў на снезе і срэбных «пуховак» на галінках вярбы да зацвітання ландыша і каліны. Гэта асаблівы і непаўторны перыяд, неацэнная падзея ў раслінным і жывёльным свеце, няспынны і здзіўляючы калейдаскоп прыродных з'яў.

Адначасова з гэтым ускладняецца наша работа — Дружыны па ахове прыроды. Існуе даўняя традыцыя — праводзіць у гэты перыяд аперацыі «Вярба» і «Бяроза». Самі іх назвы гавораць аб мэтах рэйдаў. Але для таго, каб быў поспех, трэба загадзя правесці пэўную растлумачальную работу сярод нашых сяброў, старэйшых таварышаў, падлеткаў і дзяцей. Нашай дружыне не проста правесці такую шырокую работу, і мы звяртаемся з просьбай да ўсіх, хто не толькі захапляецца, але любіць і цэніць прыроду не на словах, дапамагчы нам у гэтай важнай справе. Асаблівая надзея ўскладваецца на студэнтаў, якія праходзяць практыку ў школах. Пры неабходнасці мы можам забяспечыць іх патрэбнай літаратурай, даць адпаведныя кансультацыі.

Так, яшчэ не ўсе людзі разумеюць, а магчыма, і не хочуць уяўляць тую шкоду, якую яны наносяць прыродзе, знішчаючы сотні, тысячы верб і бяроз «для эстэтычнага задавальнення».

Вось адзін з прыкладаў. Пры правядзенні аперацыі «Вярба» ў адну з нядзель у парку культуры і адпачынку імя Луначарскага было ўстаноўлена, што за адну толькі гадзіну па пешаходнаму масту з левага берага ракі Сож праходзіць прыкладна больш трохсот чалавек з галінкамі вярбы. І ў кожнага не адна-дзве галінкі, а сорак-шэсцьдзесят. Вось які размах! Пасля такіх нашэсцяў многія дзесяткі кустоў становяцца па свайму знешняму выгляду вартымі вялікага жалю. Але здзіўляюча наіўна гучаць тлумачэнні дарослых людзей, што зрабілі гэта. Даводзілася сустракаць і такіх бацькоў, якія **не спынялі сваіх дзяцей у гэтых непрыгожых дзеяннях.** У даным выпадку даводзіцца гаварыць не толькі аб стратах, нанесеных прыродзе, але, у першую чаргу, аб стратах маральных, эстэтычных.

Дык давайце будзем разумнымі, каб у адказ не гучалі недарэчныя, горкія словы: «Як нельга? Усе ламаюць» або «Напішыце аб'яву».

Немагчыма ўявіць вясну і без шматгалосся птушак — вестуноў жыцця, радасці і цяпла. Перад іх прылётам з выраю неабходна правесці са школьнікамі растлумачальную работу, каб выхаваць у дзяцей самыя пяшчотныя і цудоўныя пачуцці да пярнатых сяброў, навучыць іх клапаціцца аб усім жывым: майстраваць і развешваць у садах і парках шпакоўні.

Спадзяемся, што нашы просьбы і парады не застануцца без увагі, каб не даводзілася потым шкадаваць аб тых вялікіх стратах, што наносяцца прыродзе.

**Р. ХАЛАДЗІЛІНА,**
**член Дружыны па ахове прыроды, студэнтка 4-га курса біялагічнага факультэта.**

# Вышыня В. Брумеля

За яго выступленнямі сачылі, затаіўшы дыханне, сотні тысяч **спартыўных балельшчыкаў на** стадыёнах Еўропы і свету. Імя гэтага **савецкага спартсмена** было знаёма ў 60-х гадах кожнаму, бо не было ў той час роўных яму сярод лёгкаатлетаў свету ў скачках у вышыню.

**У 22 гады** В. Брумель меў усе спартыўныя званні і ўзнагароды: залатыя медалі чэмпіёна Алімпійскіх гульняў, свету, Еўропы, стаў уладальнікам «За**латой каравэлы Калумба», узнагароджаны медалём «За** працоўную доблесць». Але гэта была не мяжа. І колькі б перамог атрымаў яшчэ выдатны спартсмен, каб не прыкрае транспартнае здарэнне. Аперацыі на сур'ёзна траўміраванай назе, больш двух гадоў хадзьба толькі з дапамогай мыліц. Вяртанне да паўнацэннага жыцця звязана з імем славутага ўрача-траўматолага з г. Кургана Г. А. Ілізарава. Потым — зноў трэніроўкі.

...Цяпер прозвішча В. Брумеля знаёма нам па напісаных ім у сааўтарстве з А. Лапшыным раману «Не здрадзь сабе», тэатральных п'есах, мемуарнай літаратуры. Таму невыпадкова на мінулым тыдні В. М. Брумель быў госцем кнігалюбаў і слухачоў народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ.

**(Наш кар.).**

**ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ**

# ЗМЯНШЭННЕ ВОДПУСКУ ЗА ПРАГУЛ

Для ўзмацнення барацьбы з прагульшчыкамі як асабліва злоснымі парушальнікамі працоўнай дысцыпліны дзеючым заканадаўствам цяпер даецца дазвол адміністрацыі прадпрыемства, установы, арганізацыі скарачаць тэрмін водпуску такім асобам на колькасць дзён прагула. Прымяненне гэтай меры ва ўсіх выпадках абавязковае.

У адпаведнасці з растлумачэннем Дзяржкампрацы СССР і ВЦСПС 25 кастрычніка 1983 года рабочым і служачым, якія зрабілі прагул без уважлівых прычын (уключаючы рабочых і служачых, якія адсутнічаюць на рабоце больш трох гадзін на працягу рабочага дня бесперапынна або сумарна), чарговы водпуск (гэта значыць штогадовы асноўны і штогадовыя дадатковыя водпускі) змяншаецца на колькасць дзён прагула. Аднак яго працягласць павінна быць не менш 12 рабочых дзён па календару, не ўлічваючы дадатковага трохдзённага водпуску, які прадстаўляецца жанчынам, якія маюць двух і больш дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў, а таксама дадатковых водпускаў, прадугледжаных заканадаўствам у якасці заахвочвання за выкананне дзяржаўных або грамадскіх абавязкаў.

Водпуск памяншаецца па загаду адміністрацыі за той рабочы год, у якім зроблены прагулы, незалежна ад часу яго выкарыстання. Гэта мера не з'яўляецца дысцыплінарным спагнаннем і праводзіцца незалежна ад прымянення іншых мер уздзеяння (грамадскіх, дысцыплінарных і матэрыяльных).

У выпадку звальнення работніка, які зрабіў прагул, кампенсацыя за нявыкарыстаны водпуск адпаведна змяншаецца, але выплачваецца не менш чым за 12 рабочых дзён, калі ён адпрацаваў да звальнення поўны рабочы год. Калі ж рабочы звальняецца да заканчэння рабочага года, то кампенсацыя за нявыкарыстаны водпуск выплачваецца прапарцыянальна адпрацаванаму часу, але не менш чым за 12 рабочых дзён.

**В. РУПІН,**
**юрысконсульт ГДУ.**

## УДАКЛАДНЕННЕ

У папярэднім нумары нашай газеты ў матэрыяле «Крок наперад», дзе ішла гаворка аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва за 1986 год, былі допушчаны некаторыя недакладнасці. На першай старонцы ў другім абзацы 12 радок знізу замест 3283 тыс. руб. трэба чытаць 2389,8 тыс. руб.

На другой старонцы ў гэтым жа матэрыяле апошні радок першага абзаца трэба чытаць 423,19 тыс. руб. У другім абзацы 5 радок знізу трэба чытаць замест М. І. Ефіменкі — М. І. Яфімчыка.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Кафедра фізічнага выхавання і спартыўны клуб выказваюць глыбокае спачуванне старшай выкладчыцы БАРАДЗІНОЙ Галіне Паўлаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці БАЦЬКІ.**

**Кафедра фізічнага выхавання і спартыўны клуб выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыцы БАЛДУЕВАЙ Вользе Мікалаеўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці БАЦЬКІ.**

А324155

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 154